**Я.Д.Грыгаровіч,** *прафесар*

# ДЗЕЙНАСЦЬ КАФЕДРАЎ ПА ПЛАНАВАННІ І АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў у сферы культуры, здольных ствараць новыя духоўныя каштоўнасці, новыя спосабы ўздзеяння на людзей, непасрэдна звязана са зместам і інтэнсіўнасцю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. У аснове гэтай дзейнасці ляжыць самастойная работа па атрыманні ведаў, выпрацоўцы навыкаў самаадукацыі і выхавання асобы. Сутнасць навучальнай дзейнасці ў вышэйшай школе заключаецца не столькі ў засваенні студэнтамі гатовых ведаў, колькі ў арганізацыі прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, у самастойным набыцці ведаў. Адсюль вынікае, што якасць падрыхтоўкі сучаснага спецыяліста залежыць не толькі ад рацыяналізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і майстэрства выкладчыкаў, але яшчэ ў большай ступені ад эфектыўнасці самастойнай пазааўдыторнай пазнавальнай і мастацкай дзейнасці студэнтаў па набыцці і замацаванні ведаў, уменняў і навыкаў, удасканаленні сваёй асобы.

У працэсе індывідуальнай работы студэнт перапрацоўвае вучэбную інфармацыю, дзякуючы чаму набывае новыя веды, паглыбляе набытыя, замацоўвае ўменні і навыкі самастойнай работы, авалодвае метадычнымі элементамі мастацкай і навуковай творчасці. Аднак асноўнае значэнне самастойнай работы заключаецца ў тым, што гэта – аптымальны шлях актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, развіцця пошукавага стылю і дынамічнасці разумовых намаганняў, фарміравання творчай актыўнасці асобы.

У апошні час самастойная работа студэнтаў значна ўдасканальваецца, ствараюцца ўмовы для пашырэння і паглыблення яе зместу: павялічаны час на пазааўдыторную работу за кошт скарачэння лекцыйных, семінарскіх, практычных заняткаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зменшаны аб'ём лекцыйнага матэрыялу, колькасць аўдыторных заняткаў; практыкуецца вольнае наведванне заняткаў найбольш падрыхтаванымі студэнтамі; уводзяцца індывідуальныя графікі вывучэння дысцыплін. Самастойная дзейнасць кантралюецца выкладчыкамі ў працэсе правядзення заняткаў, гутарак, калёквіумаў, на заліках і экзаменах. Аднак яе арганізацыя як комплекс мер па планаванні, кіраванні, уліку, кантролі і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні гэтай сферы яшчэ не стала абавязковай умовай паспяховай прафесійнай дзейнасці выкладчыкаў, нягледзячы на нарматыўнае абгрунтаванне такой работы. Вучэбны план, які прадугледжвае раздзел "Самастойная работа студэнтаў", абавязковы для выканання выкладчыкамі ўсіх дысцыплін, але не заўсёды кантралюецца, улічваецца і ацэньваецца імі.

Паспяховасць самастойнай работы студэнтаў залежыць ад наступных вядучых фактараў:

а) матывацыйна-патрэбнаснага, які разглядаецца як жаданне і імкненне да пазнавальнай дзейнасці, дастаткова высокая матывацыя пазнавальнай дзейнасці, патрэбнасць пастаянна працаваць, павышаць свой інтэлектуальны патэнцыял, аб'ём і якасць ведаў;

б) кагнітыўнага, які прадугледжвае набыццё уменняў і навыкаў рэалізацыі самастойнай дзейнасці, дастатковага валодання спосабамі засваення ведаў, самаадукацыі і самавыхавання;

в) арганізацыйнага, дзе галоўным з'яўляецца стварэнне ўмоў для паспяховага ажыццяўлення самастойнай работы, у тым ліку забеспячэнне неабходнага для яе аб'ёму часу ў адпаведнасці з навукова абгрунтаванымі (устаноўленымі) санітарна-гігіенічннмі нормамі. Маецца на ўвазе наяўнасць рабочага месца, матэрыяльнай базы, вучэбнай, метадычнай і дапаможнай літаратуры, тэхнічных сродкаў, музычных інструментау, відэа-, фоназапісаў і інш.

г) метадычнага, што прадвызначае педагагічна мэтазгоднае кіраванне самастойнай работай з боку выкладчыкаў з дакладным падборам (асабліва ў першыя гады навучання ў вышэйшай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучальнай установе) штодзённых разнастайных і пасільных заданняў, устанаўленнем прыблізных затрат часу, магчымых спосабаў і варыянтаў выканання работы.

Даследаванне паказала, што на самастойную работу студэнты затрачваюць у сярэднім каля трох гадзін у дзень. З іх у сярэднім падрыхтоўка да семінарскіх і практычных заняткаў займае 40 мінут, канспектаванне першакрыніц і іншай рэкамендаванай літаратуры – 30; падрыхтоўка да індывідуальных заняткаў – 50; чытанне спецыяльнай літаратуры і іншыя віды работы – 30 мінут.

Хаця сярэдняя колькасць часу адпавядае нарматыўным патрабаванням, аднак за гэтым бачыцца нераўнамернае размеркаванне работы ў розных студэнтаў. Некаторыя займаюцца да пяці гадзін у дзень, некаторыя – менш гадзіны. Каля 6% апытаных наогул не працуюць у міжсесіённы перыяд, не рыхтуюцца да семінараў і практычных заняткаў, што сведчыць аб немагчымасці засвоіць праграму і, як вынік, атрымаць добрую прафесійную падрыхтоўку.

Не заўсёды добрасумленна выконваюцца заданні для самастойнай работы. Галоўнымі прычынамі гэтага апытаныя назвалі дэфіцыт часу – 62%; адсутнасць навыкаў некаторых відаў самастойнай работы – 21%; адсутнасць вучэбнай літаратуры – 32%; недастатковасць кансультацый выкладчыкаў па методыцы самастойнай работы – 21%; нездавальняючыя ўмовы для самастойнай работы – 13%. Сярод іншых прычын найбольш часта называецца нераўнамернасць размеркавання заданняў для самастойнай работы: мінімальны аб'ём у пачатку семестра і максімальная нагрузка ў канцы, калі пачынаюцца семінарскія і практычныя заняткі па многіх тэарэтычных і спецыяльных прадметах. Значны працэнт апытаных назвалі ў ліку прычын несвоечасовага і няпоўнага выканання заданняў адсутнасць сістэматычнага кантролю з боку выкладчыкаў, увагі да якасці выканання пісьмовых работ.

Хаця нераўнамернасць размеркавання пазааўдыторнай работы студэнтаў і складанасць ажыццяўлення паэтапнага кант-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ролю за яе вынікамі з'яўляюцца спецыфічнымі для вышэйшай школы, усё ж патрабуецца пошук шляхоў удасканалення кіравання гэтым відам дзейнасці, асабліва ў першыя гады навучання. Нерэгулярна вывучаемы матэрыял не паспявае перайсці з аператыўнай памяці ў даўгачасную, што вядзе да зніжэння агульнага ўзроўню падрыхтоўкі спецыяліста. Неабходныя дасканалае вывучэнне і якасная ацэнка рытмічнасці самастойнай работы студэнтаў па кожнай з дысцыплін, удакладненне сярэдняй нагрузкі за тыдзень у межах кожнага семестра, канкрэтызацыя заданняў для самастойнай работы. Пры гэтым мы маем на ўвазе не толькі вызначэнне аб'ёму самастойнай работы ў нарматыўных патрабаваннях, але яе дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад ступені важнасці і неабходнасці па кожным вывучаемым прадмеце.

Значнымі стымуламі якасці пазааўдыторнай навучальнай дзейнасці з'яўляюцца разнастайнасць заданняў для самастойнай работы, узбагачэнне іх зместу за кошт выкарыстання розных формаў. Асаблівую цікавасць выклікаюць звычайна заданні праблемнага, пошукава-даследчага і эўрыстычнага характару. Так, пры рабоце над вучэбнай і навуковай літаратурай найбольш папулярныя падрыхтоўка водгукаў на нядаўна выдадзеныя працы, рэцэнзій на навуковыя артыкулы; складанне анатацый манаграфічных выданняў і крыжаванак па паняційным апараце навуковай дысцыпліны; распрацоўка плана навуковага артыкула па толькі што вывучанай праблеме; правядзенне "круглых сталоў"; падбор матэрыялу для дзелавой гульні і інш. Такія заданні ўзбагачаюць змест самастойнай работы, патрабуюць творчага асэнсавання праблем, бо ўжо іх змест і форма выключаюць кампілятыўнасць і фармалізм выканання.

Бесперапыннасць самастойнай работы забяспечваецца аптымальным спалучэннем планавання, навуковай арганізацыі вучэбнай працы (пры выкарыстанні розных метадаў і сродкаў навучання) і кантролю за яе вынікамі.

Планаванне мае на мэце вызначэнне асноўных відаў, формаў і тыпаў самастойнай работы студэнтаў, якія вынікаюць з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабаванняў вучэбнага плана і праграмы курса, устанаўленне аб'ёму, зместу і структуры самастойнай работы студэнтаў, распрацоўку метадаў і сродкаў яе актывізацыі, дакладнае вызначэнне нарматываў часу на яе выкананне ў адпаведнасці з важнасцю курса і загружанасцю студэнтаў. Навуковая арганізацыя працы патрабуе стварэння ўмоў для яе паспяховай рэалізацыі: вучэбна-метадычнага аснашчэння, забеспячэння педагагічнага кіравання, распрацоўкі дыдактычных сродкаў, арганізацыі дзейнасці студэнтаў, выбару аптымальных стымулюючых метадаў і відаў тэхнічных сродкаў навучання.

Пры планаванні самастойнай работы неабходна ўлічваць шэраг важных умоў, выкананне якіх у значнай ступені вызначае эфектыўнасць самастойнай работы студэнтаў: пазнавальная дзейнасць павінна весціся сістэматычна з I курса па V курс з пастаянным павышэннем складанасці зместу і методыкі ажыццяўлення; яе арганізацыя патрабуе ўліку спецыфікі будучай прафесійнай дзейнасці і індывідуальных асаблівасцей студэнтаў; любы від самастойнай работы павінен мець канкрэтны матэрыяльны вынік (анатацыя, рэцэнзія, рэферат, артыкул ці тэзісы і інш.); вынікі самастойнай работы неабходна выкарыстоўваць студэнтам на семінарскіх і практычных занятках, заліках, экзаменах, у будучай прафесійнай дзейнасці; заданні для самастойнай работы павінны быць пасільнымі, цікавымі, разнастайнымі, разлічанымі на творчую актыўнасць навучэнцаў; кожнае з іх абавязкова кантралюецца выкладчыкам у прамой ці ўскоснай форме. Планаваннем, арганізацыяй, улікам, стымуляваннем самастойнай работы, а таксама кантролем за яе прадуктыўнасцю абавязаны займацца ўсе падраздзяленні вышэйшай навучальнай установы (навукова-метадычны савет, вучэбны аддзел, метадычныя камісіі факультэтаў, прадметныя камісіі кафедраў, дэканаты, кафедры, бібліятэка і інш.).

Пры планаванні неабходна ўлічваць, што важнейшай умовай эфектыўнасці самастойнай работы з'яўляюцца разнастайнасць яе формаў, рознатыповасць заданняў, якія дазваляюць змяняць віды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці. Таму ў арсенале выкладчыка павінны сустракацца самыя розныя формы арганізацыі пазнавальнай дзейнасці: прапрацоўка канспекта лекцый; канспектаванне першакрыніц, навуковай літаратуры; выкананне заданняў, не поўнасцю забяспечаных лекцыйным курсам; падрыхтоўка дакладаў на прапанаваную выкладчыкам або самастойна выбраную тэму; удзел у алімпіядах, спаборніцтвах, конкурсах па прадмеце; напісанне рэферата на пэўную тэму; пошук прыкладаў з практыкі, якія ілюструюць тэарэтычныя палажэнні і заканамернасці; распрацоўка наглядднага матэрыялу ў слоўнай і вобразнай формах; напісанне разгорнутага плана лекцый; фармуляванне і падрыхтоўка пытанняў па вывучанай тэме; складанне апорных сігналаў па праслуханай лекцыі або самастойна вывучаным матэрыяле; падрыхтоўка рэцэнзій на новыя выданні перыядычнага друку і навуковай літаратуры па дадзенай галіне ведаў; складанне анатацый артыкулаў, кніг, рэфератаў; параўнальны аналіз выкладання аднаго і таго ж матэрыялу ў двух розных падручніках; складанне структурна-лагічных схем выкладзенага на лекцыі або самастойна вывучанага матэрыялу; фармуляванне асноўных палажэнняў навуковага артыкула, лекцыі і інш.; падрыхтоўка сціслага агляду артыкулаў з навуковага часопіса апошняга года выпуску, прысвечаных канкрэтнай праблеме; падбор наглядднага матэрыялу па тэме якіх-небудзь заняткаў і вызначэнне шляхоў яго выкарыстання ў навучальным працэсе; падрыхтоўка плана (зместу) гутаркі, дыспута, лекцыі, расказа, тлумачэння і інш.; выпісванне асноўных паняццяў (катэгорый) з указаных выкладчыкам крыніц, іх тлумачэнне; складанне крыжаванак па паняційным апараце вывучаемай навукі; рашэнне педагагічных, псіхалагічных, лагічных і іншых задач.

У аснову падрыхтоўкі спецыяліста ў галіне культуры павінен быць пакладзены прафесійна-дзейнасны падыход, г.зн. фарміраванне ў студэнтаў накіраванасці на пастаяннае набыццё ведаў, уменняў, навыкаў, неабходных для паспяховага ажыц-

цяўлення будучай прафесійнай дзейнасці, развіццё розных яе кампанентаў у іх інтэграцыйным узаемадзеянні, выхаванне асобасных і прафесійных якасцей работніка культуры.

Гэты падыход патрабуе арганізацыі разнастайных відаў такой дзейнасці, у якой бы цесна перапляталіся агульнакультурныя, педагагічныя і эстэтычныя кампаненты. Гаворка ідзе аб прадуманай сістэме розных кампанентаў дзейнасці, інтэрпрэтаванай у змесце навучання ўсім цыклам вучэбных прадметаў; у метадычнай аснашчанасці гэтага зместу, якая забяспечвае паўнацэннае засваенне ведаў і ўменняў і ўзброенасць прыватнымі методыкамі, што дапамагаюць у падрыхтоўцы да правядзення розных формаў сацыякультурнай дзейнасці; у практычнай узброенасці будучага спецыяліста, здольнага выкарыстаць атрыманыя веды і ўменні пры выкананні абавязкаў.

Дзейнасны падыход – гэта па сутнасці ўключэнне студэнтаў у розныя віды тэарэтычнай і практычнай работы, якая адлюстроўвае логіку і структуру будучай прафесійнай працы. У сувязі з тым, што дзейнасць працаўніка сацыякультурнай сферы поліфункцыянальная, г.зн. звязана з выкананнем самых розных функцый, навучанне канцэнтруецца вакол ведаў, уменняў, навыкаў, неабходных для выканання гэтай дзейнасці. Для работніка культуры інтэграваным ядром усіх функцый з'яўляецца сінтэз псіхолага-педагагічных і эстэтычных ведаў у іх адзінстве і ўзаемадзеянні, таму значна ўзрастае роля тэарэтычных абагульненняў, якія даюць магчымасць найкарацейшым шляхам засвоіць прынцыпы рашэння практычных прафесійных задач у спалучэнні з метадычнымі прыёмамі – ключом да рашэння шматварыянтных сітуацый, што пастаянна ўзнікаюць у сацыякультурнай рабоце.

Аднак у практыцы вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва, як паказалі нашы даследаванні, самастойныя заданні па тэарэтычных дысцыплінах рэдка плануюцца, уся ўвага пераносіцца на спецыяльныя практычныя і індывідуальныя заняткі, кантралюемыя звычайна больш паслядоўна. У выніку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрымліваецца парадаксальная сітуацыя: выкладчыкі спецыяльных дысцыплін, недаацэньваючы ролю тэарэтычных, перашкаджаюць (магчыма, неўсвядомлена) інтэлектуальнаму і прафесійнаму росту навучэнцаў, пазбаўляючы іх асновы прафесійнай дзейнасці і значна падаўжаючы шлях да прафесійнага майстэрства. Такім чынам, сімбіёз псіхолага-педагагічных і спецыяльных ведаў на аснове агульнага інтэлектуальнага росту студэнта дапаможа вырашыць спецыфічныя праблемы навучання ў вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ